МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Накіроўваецца па электроннай пошце заяўніка

Міністэрства адукацыі разгледзела Ваш зварот і паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 17 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі суіскальніцтва – навучанне і выхаванне, якія прадугледжваюць пераважна самастойнае засваенне навучэнцам зместу адукацыйнай праграмы, яго асабісты ўдзел толькі ў атэстацыі, якую арганізуе ўстанова адукацыі, арганізацыя, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы пасляўніверсітэцкай адукацыі.

Згодна з пунктам 5 артыкула 202 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі на II ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) забяспечваюцца паглыбленая падрыхтоўка спецыяліста, фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы з прысваеннем ступені магістра. На II ступені вышэйшай адукацыі рэалізуюцца адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, і адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста, якая забяспечвае атрыманне ступені магістра.

Палажэнне аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 снежня 2011 г. № 561, не прадугледжвае для асоб, залічаных для здачы кандыдацкіх экзаменаў і кандыдацкіх залікаў (дыферэнцыраваных залікаў) па агульнаадукацыйных дысцыплінах, засваенне зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі II ступені або адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры). Такім чынам, здача кандыдацкіх экзаменаў і кандыдацкіх залікаў (дыферэнцыраваных залікаў) па агульнаадукацыйных дысцыплінах не адносіцца да ўзроўню вышэйшай або пасляўніверсітэцкай адукацыі і не разглядаецца як форма атрымання адукацыі.

Адказ на Ваш зварот Вы маеце права абскардзіць у суд ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Першы намеснік Міністра В.А.Богуш

12 Шкуратава 200 52 01